# Калійны камбінат пушчан

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА

## Мнагалюдны мітынг на камбінаце

Прывітанне ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР выклікала новую хвалю працоўнага энтузіязму ў салігорцаў. Паўсюдна радасныя твары, ва ўсіх прыўзняты святочны настрой.

Натхнёныя выдатнай працоўнай перамогай, цёплымі словамі прывітання ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР будаўнікі першай чаргі Салігорскага калійнага камбіната сабраліся на мітынг. Будынак абагачальнай фабрыкі ўпрыгожан лозунгамі, транспарантамі.

У рэкордна кароткія тэрміны ўведзена ў строй першая чарга першынца горнахімічнай прамысловасці рэспублікі. Пабудавана абагачальная фабрыка за 12 месяцаў, замест прадугледжваемых 36, капар шахты № 2 узведзен за тры месяцы.

На будаўніцтве першай чаргі камбіната нарадзіліся новыя формы сацыялістычнага спаборніцтва, выраслі людзі. Працоўную славу заваявалі сотні праходчыкаў, будаўнікоў, мантажнікаў, людзей іншых рабочых прафесій. Сярод іх усім вядомыя імёны брыгадзіраў комплексных брыгад Івана Чабатара, Анатоля Рокаша, мантажнікі брыгад Яўгенія Прасмыцкага, Уладзіміра Ісаені, Міхаіла Чарнаморца і іншыя.

На імправізаванай трыбуне перадавікі будоўлі і вытворчасці, партыйныя кіраўнікі будоўлі, госці з калгасаў.

Мітынг адкрывае сакратар прамыслова-вытворчага парткома тав. Шлыкаў А. Е. Ён прадастаўляе слова першаму сакратару Мінскага прамысловага абкома тав. Насілоўскаму А. Б.

— З вялікай працоўнай перамогай! — віншуе ён салігорцаў.

Дружнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі сустракаюць сабраўшыяся на мітынг прывітанне ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР будаўнікам, мантажнікам і гарнякам камбіната.

Намеснік міністра будаўніцтва БССР тав. Кашчэеў М. В. віншуе калектыў будаўнікоў камбіната з выдатнай перамогай, жадае далейшых поспехаў у працы.

Выступае намеснік старшыні Саўнаргаса БССР тав. Батурын С. С.

— Савет народнай гаспадаркі, — гаворыць ён, — выражае ўпэўненасць, што эксплуатацыйнікі справяцца з даручанай задачай і ў кароткі тэрмін асвояць магутнасці па вытворчасці мінеральных угнаенняў.

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Максімаў Л. Г. зачытвае тэкст прывітання ЦК камсамола Беларусі маладым будаўнікам, гарнякам і хімікам. Прывітальнае пісьмо ўрачыста ўручаецца сакратару камітэта камсамола будаўніцтва Альфрэду Палаводаву.

— Мы запэўняем Камуністычную партыю, Савецкі ўрад, — гаворыць брыгадзір брыгады камуністычнай працы Іван Чабатар, — выканаем любыя заданні, не пашкадуем сіл, каб наша краіна з кожным днём прыгажэла і мацнела.

Аб слаўных працоўных перамогах будаўнікоў камбіната гаварылі галоўны інжынер будтрэста тав. Кавалеўскі А. І., штукатур Марыніч К. Е., брыгадзір мантажнікаў тав. Пасекаў І. В.

Ад імя беларускіх калійнікаў выступілі галоўны інжынер калійнага камбіната тав. Піёнаў М. І., машыніст горнапраходчага камбайна тав. Верашчылін Б. А. Яны запэўнілі прысутных, што калійшчыкі з гонарам пранясуць працоўную эстафету, атрыманую ад будаўнікоў.

Удзельнікаў мітынгу віталі піянеры.

Віншавальныя тэлеграмы будаўнікам Салігорскага калійнага камбіната прыслалі ЦК ВЛКСМ і калектыў Бярэзнікоўскага калійнага камбіната.

Пасля заканчэння мітынгу пад урачыстыя гукі марша першы сакратар Мінскага прамысловага абкома партыі А. Б. Насілоўскі перарэзае чырвоную стужку.

Старшы млынар уключае рубільнік. Шпеневы млын прыходзіць у рух. Каля флатацыйнай машыны — Марыя Седнёва. Абагачальная фабрыка працуе. Першая чарга першынца Салігорскага калійнага камбіната ў страі. Хутка працаўнікі сельскай гаспадаркі атрымаюць першыя беларускія калійныя ўгнаенні.

А. БЛАХІН,
рэдактар шматтыражнай газеты «За коммунистический труд».